СССР.Б

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

29 СНЕЖНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 253 (30133)

1 СТУДЗЕНЯ АЖНО ДВА СВЯТЫ... 4

У ЧЫМ СУСТРЭЦЬ ГОД ДРАКОНА? 13

КАРАТКА

• Больш як Br370 тысяч накіравана са спецфонду Прэзідэнта на падтрымку таленавітай моладзі.

• ВРП Мінскай вобласці за студзень — лістапад павялічыўся амаль на 10 працэнтаў.

• Зарплаты ўсім катэгорыям педработнікаў павышаюцца ў Беларусі з 1 студзеня.

• Прадпрыемствы Брэсцкай вобласці ў 2023 годзе нарасцілі аб'ёмы выпуску імпартазамяшчальнай прадукцыі.

• Прамысловыя прадпрыемствы Беларусі возьмуць шэфства над дзіцячымі дамамі і іншымі падобнымі ўстановамі.

ЦЫТАТА ДНЯ

Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Маладзёжная палітыка — найважнейшы кірунак. Можа быць, нават важнейшы за сельскую гаспадарку, эканоміку, гандаль. Бо калі не будзе моладзі, выхаванай правільна, то ўсё, што мы выбудавалі, не трэба будзе ўвогуле. Пры планаванні, арганізацыі праектаў, акцый і іншых мерапрыемстваў для моладзі ўпор трэба рабіць на якасны падыход і каб заўсёды была аддача і вынік».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Усё ў вашых руках. Калі вы захочаце — вы будзеце моцнымі, сапраўднымі беларусамі»

Каштоўныя парады Прэзідэнта — яшчэ адзін навагодні падарунак нашым дзецям

Дзіцячыя ўсмешкі, шчаслівы смех хлопчыкаў і дзяўчынак і самыя шчырыя жаданні — найлепшыя падарункі для дарослых на навагоднія святы. Гэтыя падарункі сваім бацькам і настаўнікам падарылі ўдзельнікі Галоўнай ёлкі краіны. Традыцыйна дабрачыннае свята праходзіць у Палацы Рэспублікі за некалькі дзён да Новага года ў рамках акцыі «Нашы дзеці». У Палац Рэспублікі былі запрошаны больш за дзве тысячы дзяцей з усёй краіны. Гэтыя дзеці, нягледзячы на свой узрост, шмат дасягнулі. Яны выдатнікі вучобы і пераможцы розных алімпіяд і творчых конкурсаў, прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, дасягаюць спартыўных вынікаў. На свята таксама былі запрошаны дзеці, якія ўжо ведаюць, што такое жыццёвыя цяжкасці — дзеці-інваліды, дзеці з сем'яў ваеннаслужачых і супрацоўнікаў праваахоўных структур, бацькі якіх загінулі пры выкананні службовых абавязкаў. Новы год межаў не мае, таму і беларускае свята адкрыта для дзяцей з Луганскай Народнай Рэспублікі, якія зараз праходзяць аздараўленне ў Магілёўскай вобласці, Латвіі, Прыморскім краі.

Фота БелТА

Па традыцыі, з юнымі гасцямі свята сустракае Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы пачаў не зусім звычайна — уручыў падарункі тым, хто звычайна гэта робіць сам — Дзеду Марозу і Снягурцы. Звяртаючыся да дзяцей, ён заўважыў, што пасля спектакля — галоўнага падарунка — кожны маленькі госць атрымае невялікія падарункі ад Прэзідэнта на памяць. Аднак, па словах Аляксандра Лукашэнкі, самае галоўнае — гэта навагоднае чараўніцтва, якое падрыхтавалі для дзяцей артысты і Дзед Мароз са Снягуркай.

«Вялікі дзякуй за нашых беларускіх дзяцей»

«Перш за ўсё, вы малайцы. Выпадковых людзей тут няма. Тут дзеці, якія заслужылі прысутнічаць на гэтым цудоўным святе», — звярнуўся да герояў дня Прэзідэнт. Удзельнікамі свята сталі каля трох тысяч чалавек разам з настаўнікамі і бацькамі. «Гэта будучыя выбітныя асобы. Гэта будучыня нашай краіны. Гэта будучыня нашай Беларусі. Таму вы малайцы, і дзякуй вам, што вы з гэтых гадоў сур'ёзна займаецеся вучобай. Я вельмі спадзяюся, што акрамя вучобы вы прыстойна займаецеся спортам. Раю вам займацца спортам, каб быць не толькі знешне прыстойным і прыгожым чалавекам, а каб быць здаровым. Я хачу пажадаць вам, папрасіць вас, каб вы і надалей радавалі сваіх бацькоў, сваіх настаўнікаў, сваіх выхавальнікаў», — звярнуўся Прэзідэнт да малых беларусаў.

СТАР. 2

Пад вальс Мендэльсона

ШЛЮБ ПАД НОВЫ ГОД: СПАНТАННЫ ВЫБАР ЦІ МАГІЯ СВЯТА?

Гродзенцы ўсё часцей жадаюць узаконіць адносіны ў апошнія дні года

Так, сёлета ў вобласці на апошні тыдзень снежня прыпадае ў два разы больш вяселляў, чым летась. Не менш актыўна адбываецца рэгістрацыя і ў папярэдні тыдзень. На гэты перыяд у аддзел загс Ленінскага раёна Гродна пададзена каля 60 заяў, што значна больш, чым летась. Многія вырашылі распісацца ў прыгожую дату 21.12.23 і 23.12.23. Не ўступаюць у папулярнасці і апошнія дні года. Чаму гродзенцы выбіраюць для шлюбу такі мітуслівы перыяд? Ці не баяцца яны, што навагоднае свята перакрые іх вясельны настрой? Карэспандэнт «Звязды» папрысутнічала падчас рэгістрацыі шлюбу і распытала маладых аб іх выбары.

СТАР. 3

З нагоды

ПАДАРУНАК АД ПЕРШАГА

Кнігі з асабістай калекцыі Аляксандра Лукашэнкі перададзены ў Прэзідэнцкую бібліятэку Рэспублікі Беларусь

Такі каштоўны падарунак дзяржаўная ўстанова атрымала з нагоды свайго 90-годдзя. Усяго бібліятэчны фонд папоўніўся 169 выданнямі. Практычна ўсе з іх — у адзіным экзэмпляры. Выданні ў розны час былі прэзентаваны кіраўніку дзяржавы вядомымі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі, прадстаўнікамі духавенства, культурнай сферы, ваеннаслужачымі, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны... Кнігі маюць навуковае, гістарычнае і культурнае значэнні.

СТАР. 3

«Усё ў вашых руках. Калі вы захочаце — вы будзеце моцнымі, сапраўднымі беларусамі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуўся і да дарослых, якія прыехалі ў Палац Рэспублікі, зрабіўшы акцэнт на настаўніках: «Вялікі вам дзякуй за нашых беларускіх дзяцей. Вы сапраўды валодаеце дарам. Мне здаецца, няма такога дару ў людзей іншых кантынентаў, іншых краін, як у беларускай жанчыны, нашых сапраўдных мужчын, якія з ранку да вечара думаюць аб нашых дзецях, выхоўваюць іх, навучаюць».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў дзяцей, якія сабраліся, розныя лёсы і розныя жыцці. У некаторых ёсць і праблемы ў сілу розных умоў. «Я проста хачу вам параіць як чалавек, у якога дзяцінства было таксама няпростае. Усё ў вашых руках. Калі вы захочаце — вы будзеце моцнымі, сапраўднымі беларусамі. Хтосьці, як гэта модна цяпер, у айцішнікі пойдзе, хтосьці стане сапраўдным раслінаводам, будзе любіць сваю зямлю. Хтосьці стане вялікім вучоным... Усё ў вашых руках. Толькі трэба праявіць больш цярпення і настойлівасці. Гэта датычыцца ўсіх. Жывіце мірна, спакойна, не хвалюйцеся аб тым, за што не трэба хвалявацца», — сказаў ён.

«Не павінна быць дзяцей, якія ўцякаюць ад вайны»

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім, хто ладзіць мерапрыемствы дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». Ён нагадаў, што гэтая акцыя зарадзілася даўно. Па словах кіраўніка дзяржавы, гэта вялікае свята для нашых дзяцей. Ён падзякаваў усім, хто падтрымлівае гэту традыцыю і акружае ўвагай і клопатам дзяцей Беларусі.

«Больш за тое, мы робім усё, каб дзеці, якія бягуць ад вайны, тут адчувалі сябе як дома. А такіх нямала. Гэта страшна. Гэта такі цяжкі падарунак ад дарослых дзецям. Мы бачым, што робіцца ў розных кутках нашай планеты. І мы робім усё, каб дзеці, якія сёння не маюць магчымасці сабрацца ў такой прыгожай зале і гаварыць са сваім Прэзідэнтам, прыязджалі да нас і адчувалі сябе тут як дома. Не павінна быць дзяцей, якія ўцякаюць ад вайны. Мы павінны падхапіць гэтых дзяцей своечасова, прывезці да сябе дадому, абагрэць і зрабіць іх дзяцінства больш шчаслівым», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён у чарговы раз паўтарыў, што ў Беларусі няма чужых дзяцей: «Яны ўсе нашы, яны родныя. Беларусь была і будзе адкрыта для ўсіх, хто страціў дом і мір у сваіх краінах. Мы аказвалі і будзем аказваць дапамогу такім дзецям, дзецям, у якіх вайна спрабуе скрасці дзяцінства».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Палацы Рэспублікі сабраліся нашы дзеці — беларускія, расійскія, украінская, палесцінскія, латвійскія і многія іншыя: «Усіх вас ад імя нас, дарослых, і ад імя ўсіх дзяцей нашай краіны я хачу вітаць у гэтай зале. Павіншаваць вас з надыходзячым Новым годам, павіншаваць вас з гэтым вялікім святам. Будзьце заўсёды здаровыя і шчаслівыя. Больш усміхайцеся, верце ў сілу дабрыні. А мы будзем побач з вамі».

Валерыя СЦЯЦКО.

У тэму

«У МЯНЕ НА НОВЫ ГОД ТОЛЬКІ АДНО ЖАДАННЕ»

Сапраўдным святам акцыя «Нашы дзеці» стала для сем'яў з Палесціны. Алена Шаат на свята прыехала са сваімі пяццю дзецьмі. Жанчына — беларуска, але 20 гадоў таму пазнаёмілася з палесцінцам, які вучыўся ў адным з мінскіх універсітэтаў, і з'ехала на радзіму мужа. Таму яе дзеці на рускай мове не размаўляюць, толькі старэйшая дачка крыху разумее. Пасля пачатку баявых дзеянняў Алену як ураджэнку Беларусі разам з дзецьмі ўдалося эвакуіраваць. Цяпер сям'я жыве ў Гродзенскай вобласці. У Беларусі дзеці ўпершыню пабывалі ў цырку, на ёлцы, і, як кажа Алена, эмоцыі ў іх засталіся незабыўныя. Але іх галоўнае жаданне — каб святы ўся сям'я праводзіла разам. Муж Алены і бацька іх дзяцей усё яшчэ знаходзіцца ў сектары Газа. «У мяне адно жаданне на Новы год. Адно-адзінае — каб мужа вывезлі з сектара Газа. У мяне няма больш жаданняў, калі шчыра. Мы ўжо паўтара месяца тут. Пакрысе ўладкоўваемся, прывыкаем. Але, вядома, нам без таты вельмі цяжка. І я хацела б, каб нам дапамаглі вывезці яго з сектара Газа. Ніяк не атрымліваецца. І ў Чырвоны Крыж мы звярталіся, і ў Міністэрства замежных спраў. Спісы Ізраіль не ўзгадніў, і ўдваіх не прапусцілі. Вядома, нам вельмі цяжка тут з пяццю дзеткамі адаптавацца. Дзяцей мы ў школу запісалі. Пасля Новага года пойдзем у школу. Але ўсе думкі ў нас там, у Газе. Перажываем у сувязі з гэтымі ваеннымі падзеямі. Як нам тату адтуль забраць — гэта для нас самае галоўнае», — падзялілася з журналістамі Алена Шаат.

Дзяўчынка з іншай палесцінскай сям'і — 12-гадовая Нахет — на рускай мове размаўляе нядрэнна. «Я рада. Я люблю ў вас у Беларусі», — шчыра дзелілася яна ўражаннямі ад навагодняга свята. Такое свята яна сустракае ўпершыню ў жыцці. І загадвае жаданне — сустрэць свята з бацькамі, каб вакол было весела.

Нашы дзеці

КАБ ЖАДАННІ ЗДЗЯЙСНЯЛІСЯ...

18 гадаванцаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прытулкам Ленінскага раёна Мінска атрымалі падарункі з рук Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ у рамках дабрачынай акцыі «Нашы дзеці». Выхаванцы СПЦ вучацца ў сярэдняй школе № 40, гуляюць у тэніс, займаюцца дзюдо, робяць шмат падзелак на занятках у творчых аб'яднаннях «Цветафорык» і «Чароўны пэндзаль». Сустракалі гасцей яны сапраўдным прадстаўленнем: вершамі, танцамі, карагодамі. Завіталі ў госці да дзяцей не толькі Дзед Мароз са Снягуркай, але і сімвал надыходзячага года — Дракон, а скончыліся відовішчы гарбатай з прысмакамі.

Фота БелТА.

У кожнага з дзяцей, якія тут знаходзяцца, няпросты лёс, і вельмі хацелася б, каб іх мары, а яны ў асноўным мараць пра сваю сям'ю, маму, тату, спраўджваліся. Вельмі важна, што ў нашай краіне шмат людзей, якія робяць усё не толькі для таго, каб працаваць у такіх цэнтрах, але і забіраць гэтых дзетак, выхоўваць іх, даваць адукацыю і цеплыню сваёй душы, заўважыла Наталля Качанава:

— Мы вельмі ўдзячныя нашым суайчыннікам, якія дапамагаюць нашым дзеткам у гэтым жыцці, і заўжды шчыра рады бываць у такіх установах, віншаваць іх. Калі прыходзіш у такія цэнтры, бачыш, што тут ёсць усё для таго, каб дзеці ні ў чым не мелі патрэбы.

Ва ўстанове выхоўваюцца дзеці, якіх забралі з праблемных сем'яў, расказала **дырэктар сацыяльна-педагагічнага цэнтра (СПЦ) з прытулкам Ленінскага раёна Мінска Аксана ГОВЕН:**

— Каб дзіця не знаходзілася ў сям'і, куды прыйшла бяда, яго змяшчаюць да нас, дзе пануе атмасфера дзяцінства і радасці, а іх бацькі тым часам (з нашай дапамогай і ўдзелам суб'ектаў профілактыкі) пераадольваюць праблемы, якія існуюць у сям'і. Дзеці чакалі навагодняга цуду і свята, вучылі вершы, песні, рыхтавалі падарункі блізкім і гасцям, пісалі лісты Дзеду Марозу. Яны, як і ўсе звычайныя малыя, замаўлялі яму цацкі, модныя адзенне, сучасныя гаджэты.

З Саветам Рэспублікі ў СПЦ склаліся добрыя стасункі, і яго Старшыня сёлета ўжо трэці раз наведала гадаванцаў цэнтра, каб павіншаваць малых з надыходзячым святам.

— Калі Наталля Іванаўна прыехала да нас упершыню, дзеці настолькі былі рады сустрэчы, што вельмі доўга не адпускалі яе. І тады Наталля Іванаўна запрасіла малых на экскурсію ў Савет Рэспублікі, і слова сваё стрымала, — успамінае дырэктар. — Мы разам з дзецьмі наведалі Савет Рэспублікі, і гэта сустрэча пакінула ў нашых выхаванцаў уражанні на доўгі час.

— Добрая традыцыя віншаваць дзяцей з Новым годам дапамагае стаць добрымі сябрамі. Мы прыходзім да вас не першы год і хочам, каб вы заўжды памяталі: вы нам патрэбныя, мы вельмі вас любім. Займайцеся спортам, творчасцю, заўжды шукайце добрых сяброў, — пажадала Наталля Качанава і ўручыла цэнтру сертыфікат на набыццё камп'ютарнай тэхнікі.

У адказ дзеці падарылі Наталлі Качанавай ёлачную цацку шар, што таксама стала традыцыяй — у Савеце Рэспублікі гэта ўжо не першае ўпрыгажэнне ад выхаванцаў СПЦ, а таксама карціну, намаляваную дзеткамі. А Старшыня паабяцала, што яшчэ абавязкова сустрэнецца з малымі.

Пасля канцэртнай праграмы і карагодаў дзеці разам з госцяй пілі гарбату з прысмакамі, паказвалі майстар-класы па роспісе імбірных пернікаў і расказвалі пра сваё жыццё і жаданні. Мяркуючы па размовах, тут падрастаюць і будучыя тэлевізіёншчыкі, і навукоўцы, і ратавальнікі. Прычым развагі ў малых часта зусім не дзіцячыя... Дзеткі вельмі кантактныя, і яны пасябліваму цэняць дабрыню і тое, што яны маюць у дадзены момант, падкрэсліла Наталля Качанава:

— Ім давялося пабачыць тое, з чым не хацелася б, каб сутыкаліся нашы дзеці. Гэта цяжка, калі дзіця забіраюць з сям'і, каб абараніць. І важна, што дзяржава робіць усё, каб дзеці адчувалі сябе паўнавартаснымі грамадзянамі і разумелі, што яны патрэбны нам, нашай краіне.

Ірына СІДАРОК.

«РАЗГЛЕДЖАНА 230 ДАКУМЕНТАЎ, І ТОЛЬКІ 28 % БЫЛІ ПАДТРЫМАНЫ АДРАЗУ»

Наталля Качанава падвяла вынікі работы экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі

Пад старшынствам спікера Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай адбылося чарговае пасяджэнне экспертнага савета пры верхняй палаце парламента. Як вядома, у такіх сустрэчах удзельнічаюць не толькі члены Савета Рэспублікі, кіраўнікі і прадстаўнікі дзяржорганаў, але і шматлікія эксперты ў пэўных галінах. Усе законапраекты праходзяць дэталёвае абмеркаванне на экспертных саветах перад тым, як яны ўносяцца на разгляд кіраўніка дзяржавы.

Трэба сказаць, што экспертны савет пры Савеце Рэспублікі быў створаны па даручэнні Прэзідэнта краіны ў чэрвені 2021 года. З таго часу ён максімальна задзейнічаны ў працэсе заканатворчасці. Гэта свайго роду «фільтр» важных для краіны заканадаўчых рашэнняў. Нарматыўныя дакументы разглядаюцца вельмі пільна, і падчас абмеркавання па кожным вядзецца дыскусія сенатараў, прадстаўнікоў дзяржорганаў, экспертаў і іншых зацікаўленых.

Гэта дае магчымасць на ранніх стадыях нарматворчага працэсу выявіць як пазітыўныя, так і негатыўныя наступствы прыняцця тых ці іншых законаў і наступнага іх практычнага прымянення. Незалежная экспертная ацэнка запатрабаванасці нарматворчых навацый набыла асаблівую актуальнасць ва ўмовах канстытуцыйнай рэформы, якая праводзілася, а таксама неабходнасці адэкватнага адказу на новыя выклікі і пагрозы.

У цэлым жа дзейнасць экспертнага савета садзейнічае павышэнню якасці і абгрунтаванасці канкрэтных прававых рашэнняў. У апошнія дні 2023 года чарговы экспертны савет стаў своеасаблівым падвядзеннем вынікаў гэтай работы.

— За двухгадовы перыяд работы мы правялі 114 пасяджэнняў, разгледзелі 230 дакументаў. З іх толькі 28 % былі падтрыманы адразу. Астатнія былі з заўвагамі, а 14 % мы ўвогуле не падтрымалі. Работа праведзена і вядзецца сур'ёзная, і я шчыра ўдзячная удзельнікам, бо гэта дадатковая праца да той, якой вы займаецеся на сваіх працоўных месцах, — адзначыла Наталля Качанава, звяртаючыся да ўдзельнікаў пасяджэння. — Але мы разумеем, што гэта патрэбна для краіны, для нашага народа, бо Прэзідэнт нас заўсёды нацэльвае на тое, што ўсе рашэнні, якія прымаюцца, мусяць быць на карысць дзяржавы і людзей. Калі пэўныя пытанні трэба вырашаць, то гэта трэба рабіць і не баяцца прымаць рашэнні там, дзе яны неабходны. А там, дзе яны неактуальныя і несвоечасовыя ці будуць негатыўна ўздзейнічаць на соцыум, яны не патрэбны.

Напрыканцы пасяджэння за вялікі ўклад у развіццё заканадаўства і актыўны ўдзел у рабоце экспертнага савета Падзякі Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу былі аб'яўлены начальніку галоўнага фінансавага ўпраўлення Мінскага гарвыканакама Тацяне Астрэйка, першаму намесніку старшыні Камітэта дзяржкантролю Дзмітрыю Баско, першаму намесніку начальніка Акадэміі МУС Аляксею Башану, першаму намесніку старшыні Мінскага гарвыканкама Надзеі Лазарэвіч, дырэктару Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Алегу Макараву, намесніку старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерыю Міцкевічу, старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іне Мядзведзевай, першаму намесніку міністра юстыцыі Наталлі Філіпавай, старшыні праўлення Банка развіцця Рэспублікі Беларусь Аляксандру Ягораву.

— Вы многае зрабілі, каб заключэнні экспертных саветаў былі правільнымі, выверанымі і ўспрымаліся, каб рашэнні, якія прымаюцца, як нам заўсёды гаворыць наш Прэзідэнт, былі на карысць дзяржавы, — рэзюмавала Наталля Качанава падчас уручэння ўзнагарод.

Алена КРАВЕЦ.

ПАДАРУНАК АД ПЕРШАГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Бібліятэка была створана ў снежні 1933 года як аддзяленне Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна пры Доме ўрада. Менавіта ў гэтым гістарычным будынку яна размяшчаецца да гэтага часу. Практычна праз пяць гадоў з дня заснавання ўстанова пераўтварылася ў юрыдычна самастойную бібліятэку і атрымала новую назву — Урадавая бібліятэка. Крыху пазней ёй просвоілі імя Максіма Горкага. Шматлікі аб'ём фонду, самаадданая праца супрацоўнікаў да пачатку 1940-х гадоў дазволілі бібліятэцы стаць адной з найбуйнейшых бібліятэк краіны. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, бібліятэку эвакуіраваць не паспелі. Каштоўны фонд быў разрабаваны і фактычна знішчаны.

У 1994 годзе Урадавую бібліятэку перайменавалі ў Прэзідэнцкую бібліятэку Рэспублікі Беларусь — і пачаўся новы этап у яе гісторыі. Пашырыліся задачы бібліятэкі, з'явіліся новыя функцыі, павялічылася катэгорыя чытачоў, якія абслугоўваюцца. За гады сваёй гісторыі бібліятэка пераўтварылася ў найбуйнейшы інфармацыйны цэнтр па пытаннях дзяржаўнага кіравання, эканомікі, палітыкі, права і парламентарызму. Ажыццяўляючы бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне органаў улады, у першую чаргу кіраўніка дзяржавы, бібліятэка з'яўляецца даступнай для ўсіх грамадзян, якія жывуць на тэрыторыі нашай краіны.

Як адзначыў **дырэктар Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Сяргей КВАЧАН,** з пачуццём вялікай удзячнасці супрацоўнікі бібліятэкі прымаюць у падарунак кнігі ад кіраўніка дзяржавы. «Гэта не толькі прыемна, а

Фота БелТА.

і накладае дадатковую адказнасць па шырокай папулярызацыі выданняў, — дадаў ён. — Гэтую работу мы зробім якасна».

Па словах дырэктара, за 90 гадоў існавання бібліятэка дасягнула шмат чаго. «Укараненне інфармацыйных тэхналогій дазволіла значна палепшыць абслугоўванне чытачоў, — заўважыў Сяргей Квачан. — У нашай дзейнасці мы выкарыстоўваем 16 спецыялізаваных сістэм, якія дазваляюць больш эфектыўна працаваць з наведвальнікамі».

Аснову любой бібліятэкі складаюць яе фонды. Па колькасці ўнікальных кніг, якія знаходзяцца ў фондзе Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, дзяржаўная ўстанова з'яўляецца адным з лідараў у краіне.

Багацце і каштоўнасць любой бібліятэкі — рэдкія выданні. Іх у Прэзідэнцкай бібліятэцы нямала. Найстарэйшае выданне, якое ўяўляе сабой зборнік дакументаў па прававой дзейнасці, датуецца 1542 годам. Выданне мела шмат перавыданняў і шырока выкарыстоўвалася.

У фондзе старадрукаваных і рэдкіх выданняў можна ўбачыць Тураўскае Евангелле 1869 года выпуску, кнігу Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі» 1759 года, выдадзеную на англійскай мове, Слоўнік беларускага прыслоўя Івана Насовіча, датаваны 1870 годам. Тут — і Статут Вялікага Княства Літоўскага рэдакцыі 1588 года, выпушчаны ў 1744 годзе, і Стары Запавет на пергаменце, які да сярэдзіны XIX стагоддзя выкарыстоўваўся ў Гомельскай епархіі.

Асаблівы гонар бібліятэкі — чатыры экзэмпляры зборніка вершаў «Вянок» Максіма Багдановіча. Тут і мініяцюрныя выданні, якія з'яўляюцца бібліяграфічнай рэдкасцю, і кнігі з аўтографамі саміх пісьменнікаў. У прыватнасці, раман Івана Шамякіна «Глыбокая плынь». Народны пісьменнік БССР быў пастаянным чытачом бібліятэкі. У фондзе захоўваюцца ўсе Канстытуцыі, якія маюць дачыненне да нашай краіны.

Практычна ўсе выданні бібліятэкі, у тым ліку рэдкія, алічбаваны. Акрамя таго, Прэзідэнцкая бібліятэка валодае найбагацейшым архівам друкаваных выданняў. Прычым не толькі рэспубліканскага, але і раённага значэння. Усе яны прадстаўлены яшчэ і ў электронным варыянце. Дарэчы, архіў газеты «Звязда» ў бібліятэцы прадстаўлены найбольш поўна.

Супрацоўнікі бібліятэкі займаюцца яшчэ і штодзённым манітарынгам сродкаў масавай інфармацыі, вядуць актыўную экспазіцыйную дзейнасць. У цяперашні момант у бібліятэцы прадстаўлена выстава кніг аб гісторыі айчыннага права «Развіццё выбарчай сістэмы ў Беларусі: ад вытокаў — да сучаснасці».

«Тэмы выстаў мяняюцца штомесячна, яны заўсёды актуальныя, — звярнула ўвагу **намеснік дырэктара Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь па асноўнай дзейнасці Ала ПЕНДА.** — Кнігі павінны быць даступныя. Чытач не заўсёды арыентуецца ў каталозе і часта не можа вызначыцца з тым, што яму патрэбна. Таму мы даём магчымасць убачыць, што ў нас прадстаўлена».

Супрацоўнікі бібліятэкі з'яўляюцца яшчэ і арганізатарамі шматлікіх мерапрыемстваў, у тым ліку ў рэгіёнах, рэалізатарамі многіх праектаў. Адзін з апошніх — падрыхтоўка кнігі «Яны былі першымі» (аб дэпутатах Вярхоўнага Савета БССР першага склікання, якія загінулі і зніклі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны).

Адным словам, у Прэзідэнцкай бібліятэцы не проста захоўваюць кнігі, але і ствараюць іх, папулярызуюць літаратуру, робяць усё дзеля таго, каб кніга ў высокатэхналагічным грамадстве не страціла свайго высакароднага статусу.

Вераніка КАНЮТА.

ШЛЮБ ПАД НОВЫ ГОД: СПАНТАННЫ ВЫБАР ЦІ МАГІЯ СВЯТА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Загс у гістарычным цэнтры Гродна — самы запатрабаваны сярод маладых пар. Наплыў сюды стаў яшчэ большым пасля таго, як сёлета перастаў дзейнічаць гарадскі загс на бульвары Ленінскага камсамола. А паколькі будынак існуючага загса невялікі, горад выдзеліў для ўрачыстай рэгістрацыі былы палац Тызенгаўза. Старажытны аб'ект адноўлены ў традыцыях каралеўскай эпохі. Тут рэгістрацыя маладых праходзіць, як правіла, вельмі пышна, з вялікай колькасцю гасцей. У самім загсе такіх умоў няма, тут зала для рэгістрацыі невялікая.

Між тым, па словах спецыялістаў, гродзенцы цяпер часцей схіляюцца да камернай працэдуры рэгістрацыі. Аб гэтым сведчаць і жаданні маладых, якія вырашылі распісацца напярэдадні Новага года.

Напрыклад, Кацярына і Павел наогул прыйшлі адны. Можа таму, што ў абодвух гэты шлюб не першы. Але маладыя людзі не згубілі надзею ўладкаваць сваё сямейнае жыццё і вельмі ўзрушаны будучай падзеяй. Кацярына — педагог-арганізатар у школе, Павел — ветэрынарны ўрач, працуе на мясакамбінаце, праўда пакуль не па сваёй спецыяльнасці. Спадзяецца, што ў новым годзе з'явіцца для яго адпаведная вакансія.

Пазнаёміліся яны ў інтэрнэце. Як абодва жартуюць: «Новы трэнд — інтэрнэт». Перапіска прывяла да сустрэч, а потым і сюды, у загс. Але чаму менавіта ў пераднавагодні час? Як высветлілася, рашэнне ўзнікла спантанна. Калі прыйшлі падаваць заяву, работнікі загса прапанавалі перадсвяточную дату.

— Мы падумалі: а чаму не? Гэта так крута! Цяпер кожны Новы год будзе яшчэ і чарговай датай сумеснага жыцця. Прытым падзея сама па сабе сімвалічная — пачатак новага года і пачатак новага сямейнага жыцця! — узрушана дзеліцца эмоцыямі Кацярына.

Свае спадзяванні маладая пара звязвае з папаўненнем сям'і. «І выйграць кватэру ў наступным годзе!» — жартуе Павел. «Галоўнае, каб усе былі здаровыя — і родныя, і бацькі. І каб было мірнае неба», — выказвае сваю думку яго спадарожніца. Яна пераканана, што ў навагоднюю свята ўсе пажаданні абавязкова збудуцца.

У якасці сужэнцаў сустрэнуць Новы год гродзенцы Марта і Аляксей. Так супала, што ў маладых аднолькавае прозвішча. «Не трэба і пашпарт мяняць», — жартуе нявеста.

Для абодвух Новы год — дата сімвалічная. Менавіта 1 студзеня адбылося іх знаёмства. І вось праз некалькі гадоў кола адносін замкнулася заручальнымі пярсцёнкамі.

— Мы не маглі абысці дату нашага знаёмства, таму вырашылі ўзаконіць свае адносіны менавіта напярэдадні Новага года. Цяпер гэта свята стане для нас яшчэ і напамінам аб нашай першай сустрэчы, можна сказаць, што Новы год падарыў нам шчасце, — дзеліцца сваімі разважаннямі 20-гадовая Марта. Яна прызналася, што стала ініцыятарам рэгістрацыі напрыканцы года, бо наступны год — высакосны. «Думаю, што разам мы пераадолеем цяжкасці», — рэзюмавала нявеста. «Магчыма, нам удасца ў будучым годзе завяршыць рамонт у кватэры», — падзяліўся турботамі Аляксей. Яго бацькі пагаджаюцца з сынам. Магчыма, таму і не плануюць рабіць шумнае вяселле. Сродкі лепш укласці ў надзённыя патрэбы, віншаванні атрымаць ад самых блізкіх — гэта будзе і шчыра, і душэўна. Таму на ўрачыстасць збяруцца толькі родныя і блізкія сябры.

— Вялікае вяселле патрабуе значных расходаў, да таго ж хочацца, каб усё было спакойна, акуратна, цывілізавана, — тлумачыць Аляксей. — Таму вырашылі святкаваць з самымі блізкімі людзьмі. Да таго ж, мы не любім да сябе ўвагі.

Як аказалася, само паняцце «вяселле» губляе традыцыйны сэнс. Вялікія і шумныя застоллі становяцца рэдкасцю. Дарэчы, рэгістрацыі, якія я ўбачыла, прайшлі сціпла, без традыцыйнага вальса Мендэльсона. Як расказала **начальнік аддзела загса адміністрацыі Ленінскага раёна Гродна Святлана АНЕГІНА**, цяпер многія імкнуцца мінімізаваць гэту падзею. Пары моцуць прыйсці і, як кажуць у народзе, проста распісацца. Але і для тых, хто рэгіструе шлюб у кабінеце, праводзіцца мінімальная цырымонія з абменам пярсцёнкамі, а не проста ўручэнне дакументаў. Фармат рэгістрацыі абгаворваецца падчас падачы дакументаў.

— Цяпер у нас напружаны час, работа, можна сказаць, кіпіць. Напярэдадні Новага года ўсе хочуць быць шчаслівымі, многія прымаюць рашэнне аб'яднаць два святы ў адным, узаконіць свае адносіны і адзначыць гэту падзею на Новы год. Асабліва насычаныя апошнія дзесяць дзён года. Самая запатрабаваная дата 23 снежня. Лічба выглядае прыгожа — 23.12.23. У гэты дзень мы зарэгістравалі 17 пар. А ўсяго за два перадсвяточныя тыдні — каля паўсотні. Гэта больш, чым за такі ж леташні перыяд. Вельмі запатрабаваныя пятніца і субота, 29 і 30 снежня. Хоць заяву па заканадаўстве можна падаць і за тры дні, некаторыя браніравалі гэтыя даты яшчэ ў сярэдзіне года, — паведаміла Святлана Анегіна.

Як сведчыць статыстыка, апошнім часам менавіта снежань стаў адным з самых папулярных месяцаў для рэгістрацыі шлюбу. Лічыцца, што ў навагоднія вяселлях ёсць рамантыка. Гэтаму спрыяе і навакольная абстаноўка — усё зіхаціць навагоднімі агнямі, радуюць вока ўпрыгожаныя ялінкі, і, наогул, перадсвяточная мітусня падымае настрой. Вядома, такія фактары ўносяць свой каларыт у пераднавагоднюю рэгістрацыю шлюбу. І нават калі сама працэдура не шматлюдная, атмасфера стварае адчуванне свята пры самым сціплым фармаце рэгістрацыі.

Але не толькі знешні антураж важны для маладзёнаў. Некаторыя жадаюць уступіць у новы год у статусе мужа і жонкі. Як паказала размова з парамі, усе зрабілі свой выбар асэнсавана і спадзяюцца на шчаслівы шлюб. Магчыма, гэта звязана з тым, што павялічваецца ўзрост шлюбных пар. Калі раней жанчыны выходзілі замуж у сярэднім у 21 год, а мужчыны ў 25, цяпер — у 25 і 30 гадоў адпаведна.

Ёсць і ўзроставыя рэкарднсмены. Самым сталым жаніхом у Гродне сёлета стаў 77-гадовы мужчына, а самай узроставай нявестай — 74-гадовая жанчына.

Звяртаюць гродзенцы ўвагу і на магію лічбаў. Такіх нямала чакаецца і ў будучым годзе. У прыватнасці, ёсць ахвотныя распісацца 24.02.2024, шэсць пар ужо запісаліся на 24.08.2024. Не застануцца без увагі і такія даты, як 21.01.2024, 02.02.2024, 04.04.2024 ды іншыя.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ГОД НОВЫ, СТО ШОСТЫ...

Чаму 1 студзеня беларусам варта згадваць пра яшчэ адно свята

Так склалася, што гэта важная для беларусаў дата «схавалася» за самае любімае і доўгачаканае свята — Новы год. 1 студзеня за святочна-бліскучымі віншаваннямі мы мала згадваем пра іншую нагоду — менавіта ў гэты дзень у 1919 годзе было абвешчана аб стварэнні ССРБ — Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі, якая стала пасля БССР, а крыху больш за трыццаць гадоў назад — Рэспублікай Беларусь. Атрымліваецца, 1 студзеня — ні больш, ні менш — дзень нараджэння нашай дзяржавы. І ў першы дзень 2024 года яна адзначае сваё 105-годдзе.

З загадчыкам аддзела навейшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, кандыдатам гістарычных навук Сяргеем ТРАЦЦЯКОМ мы гаварылі пра гэту дату і яе значэнне не аднойчы, у розных кантэкстах — да яе 100-годдзя было шмат публікацый. Мінула толькі пяць гадоў, але колькі ўсяго змянілася — і ў краіне, і ў свеце. Таму гэтым разам наша «юбілейная» размова атрымалася з папраўкай на сучаснасць.

— Сяргей Аляксандравіч, задам вам пытанне, якое звычайна гісторыкам не задаюць, бо гісторыя, як вядома, не церпіць умоўнага ладу. Што было б, калі б на тым зломе эпох у 1917—1920 гадах Беларусь пайшла па іншым шляху? Ці былі гэтыя іншыя шляхі ўвогуле і да чаго б яны ўрэшце беларусаў прывялі?

— Калі глядзець праз рэтраспектыву сённяшняга дня, тое, што адбылося 1 студзеня 1919 года, аказалася аптымальным варыянтам для Беларусі. Вы кажаце пра іншы шлях? Беларусь не разглядалася ні Польшчай, ні Германіяй, ні той жа Літвой, ні нават Украінай як самастойны акцёр геапалітычнай гульні і вялікай палітыкі. Тэрыторыя Беларусі была для іх разменнай манетай у гэтай самай гульні, і разлічваць на нейкую суверэннасць тут беларусам не даводзілася. Савецкая ж Расія абвясціла права народаў, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі, на самавызначэнне, гэта права так ці інакш дазволіла рэалізаваць і нават паспрыяла гэтаму. Калі ў верасні 1917 года У. Ленін пісаў, што бальшавіцкі ўрад дасць поўную дзяржаўную свабоду і Украіне, і Фінляндыі, і Беларусі — то ўрэшце ён гэту праграму і рэалізаваў. Іншая справа, што сама рэалізацыя залежала ад вялікай колькасці тактычных і стратэгічных фактараў. Таму і атрымалася так, што 1 студзеня 1919 года Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі паўстала, але ёй патрэбен быў пэўны час, каб стаць на ногі. А тады гэтага пэўнага часу ёй польска-савецкая вайна не дала. Так што, калі казаць пра будаўніцтва, станаўленне беларускай дзяржавы, яно адбылося ўжо ў 1920—1927 гадах. Прычым адбывалася, асабліва на самым пачатку, у складаных умовах — на невялікай частцы тэрыторыі, якую займалі этнічныя беларусы (спачатку, як ведаеце, гэта было ўвогуле толькі шэсць паветаў)...

— А што можна адказаць тым скептыкам, якія сцвярджаюць, што першым нацыянальным дзяржаўным утварэннем была БНР?

— Беларуская Народная Рэспубліка так і не спраўдзілася як дзяржава, ды і ў той сітуацыі яна ў тым выглядзе, у якім была заяўлена трыма ўстаўнымі граматамі, і не магла спраўдзіцца ў прынцыпе. Дарэчы, у лістападзе-снежні 1918 года Рада БНР спрабавала вялікую колькасць геапалітычных камбінацый. І федэрацыю з Украінай, і аднаўленне ВКЛ у новым выглядзе — Літоўска-Беларускай дэмакратычнай рэспублікі. Спрабавалі дамовіцца і з Польшчай, тым больш Юзаф Пілсудскі паўсюль разводзіў сваю федэралістычную рыторыку. Аднак высветлілася, што нічога рэальнага за ўсім гэтым няма.

Чаго не было ў БНР? У яе не было тэрыторыі, насельніцтва і пабудаванай сістэмы органаў публічнай улады — большасці асноўных фактараў, якія вызначаюць суверэнітэт. Быў урад, былі дэкларацыі аб намерах, былі мясцовыя беларускія рады, але не было дзяржаўнага арганізма. Што датычыцца ССРБ, то з самага пачатку ў яе была тэрыторыя — шэсць паветаў, але рэальная. У адрозненне ад БНР, якая абвясціла сваёй тэрыторыяй усю плошчу рассялення этнічных беларусаў, але гэта плошча ёй не належала, і рэальная ўлада там ажыццяўляцца не магла... У 1920 годзе, калі прагналі палякаў, ССРБ пачала ў поўнай меры рэалізоўваць сваю ўладу на тэрыторыі з насельніцтвам, якое гэтай уладзе падпарадкоўвалася. Пачалося будаўніцтва ўсіх органаў улады зверху данізу, пачалося стварэнне сістэмы ўласнага заканадаўства. І пасля далучэння ўсходніх рэгіёнаў у 1924—1926 гадах на новых тэрыторыях не давялося нічога ствараць з нуля, бо ў тых шасці паветах ужо была зладжаная зразумелая сістэма кіравання.

— А ў той шалёны час, калі развалілася некалькі імперый і на іх абломках паўстала не адна новая краіна, у Беларусі былі нейкія шанцы стаць, вобразна кажучы, Швейцарыяй, і не заключаць пры гэтым ні з кім ніякіх саюзаў?

— Без саюзнікаў ніводнае дзяржаўнае ўтварэнне, якое ўзнікла б на нашай тэрыторыі ў выніку распаду імперыі, проста не ўтрымалася б. З усіх бакоў былі мацнейшыя суседзі, якія мелі віды на гэтыя землі. Не трэба забываць і пра тое, што ССРБ ствараласа на выпаленай вайной і разрабаванай нямецкай акупацыяй зямлі. У той жа Гродзенскай губерніі на пачатку 1919 года заставалася менш за палову даваеннага насельніцтва. Многія сельскагаспадарчыя землі прыйшлі ў запусценне, параслі хмызнякамі. Да таго ж, нямецкія акупанты, адступаючы, спрабавалі вывезці ўсё, да чаго толькі маглі дацягнуцца. Засталіся сведчанні, што з палаца ў Шклове вывезлі нават дзвярныя ручкі...

Савецкая Беларусь адразу пачала перагаворы з Савецкай Расіяй, паколькі ў разбуранай вайной краіне было вельмі складана будаваць дзяржаву ўласнымі сіламі і за ўласны кошт. Тым больш што трэба было вярнуць і тыя ўстановы, і тых бежанцаў, якіх вымела на ўсход, у Расію, Першая сусветная вайна.

— Мне здаецца, тут яшчэ сыграла і прыхільнасць да слова «сацыялістычная» — менавіта гэты новы грамадскі лад адкрываў для беларусаў перспектыву «людзьмі звацца»...

— Сапраўды, у Расіі пачалі будаваць сацыялізм, і адным з першых крокаў было правядзенне аграрнай рэформы («Зямля — сялянам» — адзін з галоўных рэвалюцыйных лозунгаў). Для беларуса свая зямля — гэта і мара, і самая вялікая каштоўнасць. І гэта было важным фактарам у прыхільнасці да саюза з усходнім суседам. Хоць, трэба заўважыць, што на пачатку на тэрыторыі ССРБ, а пасля Беларуска-Літоўскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, якая праіснавала зусім нядоўга, з зямельным пытаннем нарабілі памылак. Замест таго, каб перадзяліць памешчыцкую зямлю паміж сялянскімі гаспадаркамі (як у Расіі), урад нацыяналізаваў яе і паставіў арганізоўваць саўгасы. Прычым кіраўнікамі іх нярэдка станавіліся былыя памешчыцкія ўпраўляючыя, а то і самі памешчыкі... І гэта досыць моцна пахіснула аўтарытэт савецкай улады сярод тых жа сялян.

— Але гэта былі памылкі, на якіх вучыліся?

— Так, вучыліся — ужо ў 1921 годзе ўрад Чарвякова правёў перадзел зямлі на карысць сялянскіх гаспадарак. Саўгасы ў нейкім выглядзе засталіся, але сяляне атрымалі свае доўгачаканыя надзелы... Калі зноў вяртацца да пачатку размовы пра магчымыя варыянты... Польскія акупацыйныя ўлады аднаўлялі памешчыцкія землеўладанні, зноў робячы з беларускіх сялян беззямельных парабкаў. Больш за тое, яны патрабавалі ад сялян аплачваць памешчыкам урон, які тыя панеслі ад савецкай улады. А БНР у сялянскім пытанні пракалолася на тым, што аказалася не ў стане ператварыць у жыццё абвешчаныя лозунгі аб «перадачы ўсёй зямлі працавітаму сялянству»...

— Літаральна праз тры гады пасля ўтварэння ССРБ увайшла ў склад СССР. І тут скептыкі заўважаюць, што ад самастойнай рэспублікі засталася адна дэкларацыя — усё цэнтралізавана стала падпарадкоўвацца Маскве...

— ССРБ, якая стала БССР, была такім жа раўнапраўным стваральнікам Савецкага Саюза, як і РСФСР, і Украінская ССР, і Закаўказская Федэрацыя. І ўвайшла яна ў склад Савецкага Саюза са сваімі органамі ўлады і сваёй Канстытуцыяй. Дарэчы, агульнасаюзная Канстытуцыя была прынята толькі ў студзені 1924 года, і толькі пасля гэтага Канстытуцыі рэспублік пачалі прыводзіцца ў адпаведнасць з ёй. У БССР выпрацоўка новай Канстытуцыі зацягнулася да 1927 года.

— І яна ўжо мала чым адрозніваласа ад агульнай савецкай?

— У нашай Канстытуцыі было шмат палажэнняў, якіх не было ні ў агульнай, ні ў заканадаўстве саюзных рэспублік. Напрыклад, істотна адрозніваліся паўнамоцтвы органаў мясцовай улады, зямельныя стасункі. Расійскае заканадаўства (ды і саюзнае) зыходзіла з таго, што асноўным землекарыстальнікам на вёсцы з'яўляецца сялянская абшчына, а беларускае — што сялянскі двор. Пагадзіцеся, вельмі адрозны падыход. Сялянскі двор сам будаваў свае адносіны з землеўладальнікам — дзяржавай і іншымі сялянскімі дварамі.

— Гэта было, несумненна, добра для селяніна, але пасля, напэўна, ускладніла працэс калектывізацыі?

— Спробы калектывізацыі ў БССР рабіліся яшчэ ў 1920-я гады, калі наркамам земляробства быў Дзмітрый Прышчэпаў. Зыходзілі з таго, што асновай рассялення сялян па былых панскіх землях павінны стаць пасёлкі, якія, у сваю чаргу, бачыліся як аснова сельгаскааператывaў. І ў 1927—1928 гадах Прышчэпаў агучыў думку, што невялікія кааператывы — гэта пройдзены этап, трэба пашырацца, ствараць калгасы. Але саюзная калектывізацыя, якая пачалася ў 1929-м, атрымала як аснову мадэль, распрацаваную для поўдня Расіі, стэпавай і чарназёмнай зоны, таму пачалі ствараць буйныя гаспадаркі, часам быў адзін калгас-гігант на цэлы раён. Яны былі не толькі эканамічна слабыя, але імі і кіраваць было немагчыма. А вось у БССР калгасы былі невялікія. Яны былі кампактныя, добра кіруемыя, гэта, як правіла, былі аб'яднанні жыхароў адной-дзвюх вёсак, якія добра ведалі адно аднаго. Магчыма, таму ў нас і не было голаду, які на пачатку 1930-х ахапіў Украіну і Паўночны Каўказ. Беларусь увогуле, у адрозненне ад той жа Украіны, была добра кіруемай рэспублікай. Ва Украіне ў канцы 1920-х — пачатку 1930-х годаў адміністрацыйны ўклад быў такі, што ўсе 700 раёнаў падпарадкоўваліся непасрэдна сталіцы, і ў Харкаве нярэдка проста не ведалі, што робіцца на месцах...

— Тут варта ў нашай гутарцы закрануць яшчэ адну вельмі важную для беларусаў рэч — адукацыю. Для тагачаснага беларуса яна была гэткай самай каштоўнасцю і сімвалам дабрабыту, як і зямля...

— Развіццё нацыянальнай адукацыі трымалася не толькі на энтузіязме рупліўцаў — Карскага, Купалы, Жылуновіча, але, несумненна, і на адпаведнай дзяржаўнай палітыцы і адпаведных дзяржаўных мерах. Бальшавікі зыходзілі з пасылу французскага рэвалюцыянера Жоржа-Жака Дантона: народу пасля хлеба патрэбна асвета. Палітыка была ў тым, каб стварыць масавую народную інтэлігенцыю, запусціць, як сёння кажуць, сацыяльныя ліфты, якія дазволяць выхадцам з рабочых і сялян заняць адпаведныя вышыні ў грамадстве, сфарміраваць новую — сацыялістычную — эліту. Адразу пасля абвяшчэння ССРБ пачалася работа па стварэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, і ў 1921-м ён ужо пачаў дзейнічаць. У 1922 годзе быў створаны Інстытут беларускай культуры, які пачынаўся з 15 навуковых супрацоўнікаў. А ўжо ў 1929 годзе ён стаў паўнавартаснай Акадэміяй навук — і там ужо 128 навуковых супрацоўнікаў, прычым не толькі запрошаных ад суседзяў, але ўжо і сваіх, падрыхтаваных у тым жа БДУ. Падрыхтаваныя інжынеры з сялянска-рабочых сем'яў занялі кіруючыя пасады на новаствораных прадпрыемствах. Дарэчы, у гэтым плане вельмі паказальная перапіска членаў сем'яў, разарваных мяжой па Рыжскім дагаворы. З Савецкай Беларусі людзі пісалі: мой сынок вывучыўся на інжынера. Ці на настаўніка. Ці на ваеннага. А для беларусаў, якія жылі «пад Польшчай» гэта было сапраўднае недасяжнае дзіва: сялянскія дзеці выбіваюцца ў людзі, не адмаўляючыся ад таго, што яны беларусы, атрымліваючы адукацыю на роднай мове...

— Увогуле, мне здаецца, трэба гаварыць пра беларускі цуд і вывучаць гэта ў школе. Мы пабудавалі сваю дзяржаву, стварылі сваю нацыянальную адукаваную эліту літаральна за пару дзесяцігоддзяў, у той час, як іншым народам у той жа Еўропе спатрэбіліся на гэта стагоддзі...

— Ну, беларускі цуд, бадай што занадта, бо такі «цуд» здарыўся і з іншымі рэспублікамі Савецкага Саюза, якія дагэтуль не мелі ўласнай нацыянальнай дзяржаўнасці і якія менавіта ў гэтым аб'яднанні атрымалі магчымасць стварыць яе фактычна з нуля. Гэта і рэспублікі Сярэдняй Азіі, і каўказскія рэспублікі. Беларуская нацыянальная дзяржава — сапраўды прадукт першай паловы XX стагоддзя, але ўсё ж з вопытам гістарычных дзяржаўных утварэнняў.

— У кантэксце нашай размовы нельга не закрануць і тэму Вялікай Айчыннай вайны. Можна сказаць, што дзякуючы шляху, па якім пайшла Беларусь у студзені 1919-га, наш народ, нягледзячы на велізарныя страты, захаваўся і з гонарам называе сябе народам-пераможцам...

— Тут трэба сказаць, што акупацыя не знішчыла беларускай савецкай дзяржавы. Дзейнічаў урад, дзейнічалі кіруючыя партыйныя органы, прычым некаторыя на месцы, у падполлі. Дзяржаўная сістэма жыла, і як толькі стала магчымым, вярнулася і пачала ажыццяўляць кіраўніцтва рэспублікай, не дапусціла хаос, які хутка ўзнікае пасля вялікіх узрушэнняў... Вайна, канешне, была самым вялікім выпрабаваннем, але... Якая яшчэ з краін Еўропы і ўвогуле свету можа назвацца рэспублікай-партызанкай? Якая яшчэ з краін Еўропы і ўвогуле свету можа сказаць, што яна была раўнапраўным сузаснавальнікам ААН — не па чыйёсьці прыхамаці, а па праве? За дзесяць пасляваенных гадоў было не толькі адноўлена ўсё страчанае — рэспубліка набыла іншае аблічча, стала індустрыяльна-аграрнай часткай тэхналагічнага ядра ўсёй сацыялістычнай сістэмы.

— Скептык зноў скажа, што на гэта была воля Масквы. Але мне здаецца, што тут вялікую ролю іграла і ўласная нацыянальная эліта, якая стаяла на чале рэспублікі...

— Так, у нас была ўнікальная дзяржаўная эліта, якой больш ні адна з савецкіх рэспублік не мела. Так званая партызанская эліта, якая трымала рэспубліку ў сваіх руках сорак гадоў. Гэта людзі, якія ваявалі за сваю зямлю ў партызанскіх атрадах, якія гатовы былі загінуць за яе, і таму ў мірны час, будучы, несумненна, савецкімі патрыётамі, дбалі найперш пра сваю родную рэспубліку. Менавіта гэта эліта ўзяла курс на звышіндустрыялізацыю БССР і змагла аргументаваць гэта на саюзным узроўні. Адзін прыклад: менавіта кіраўніцтва Савецкай Беларусі ў свой час адстаяла БелАЗ. У Маскве ў 1970-я гады ўжо было гатова рашэнне аб закупцы для СССР велікагрузных самазвалаў у Японіі — так, маўляў, танней. Але прынцыповая пазіцыя беларускіх кіраўнікоў і вучоных-машынабудаўнікоў даказала, што БелАЗ хаваць рана.

— І гэтыя прынцыповыя беларускія кіраўнікі і вучоныя — фактычна дзеці тых самых непісьменных сялян, якім рэспубліка, створаная 105 гадоў назад, дала магчымасць атрымаць адукацыю і стаць тымі, кім яны сталі.

— Сапраўды, гэта генерацыя партызан-кіраўнікоў на чале з Пятром Машэравым — практычна ўсе сялянскія дзеці, народжаныя ў 10-я гады XX стагоддзя, якія вучыліся і абіралі свой шлях ужо ў Савецкай Беларусі... Ды ў нас і сёння большасць эліты — унукі, праўнукі тых сялян. Мо таму і сёння так дбаюць пра сваю краіну — спраўджаную мару продкаў «людзьмі звацца»?

— Гаворачы пра час сённяшні. Калі б вам давялося выступаць перад аўдыторыяй і даказваць, што 1 студзеня 1919 года — знакавая для беларусаў дата, якія аргументы са спасылкай на сучаснасць вы прывялі б найперш?

— Я прапанаваў бы адказаць на простыя, здавалася б, пытанні. Ці можа краіна без уласнай дзяржавы адстаяць саму сябе? Ці можа народ, які не мае ўласнай дзяржаўнасці, захавацца як народ? Паглядзіце на тое, што робіцца ў свеце, і стане зразумела, што гэта немагчыма. Чым не нагода больш паважліва і ўважліва ўгледзецца ў сваю гісторыю?

Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Слухай сваё

Навагодні радыёэфір

Сапраўдную святочную эстафету ў навагоднія дні рыхтуюць сваім слухачам радыёстанцыі Белтэлерадыёкампаніі. Нас чакаюць спецыяльныя тэматычныя эфіры, віншавальныя паштоўкі, прызы для самых актыўных і музычнае суправаджэнне.

У нядзелю, 31 снежня, у апошнія пераднавагоднія гадзіны «Тэатр беларускага радыё» запрашае слухачоў на аўдыёспектаклі з неверагоднымі казачнымі сюжэтамі. А ў першыя гадзіны новага года ў эфіры перадачы «Накцюрны» будуць гучаць святочныя хіты ў выкананні заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Акадэмічнага хора і Сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі. Пасля 1 і 2 студзеня аўдыторыю чакаюць дзве гадзіны навагодняга хіт-параду. У ім пачуем кампазіцыі Насці Краўчанка, Данііла Мышкаўца, Ганны Благавай і іншых пераможцаў па выніках галасавання слухачоў у праекце «Наш хіт-парад», а яшчэ артысты раскажуць, як сустракаюць Новы год і падзеляцца планамі на 2024-ы. Інтэрактыўны марафон віншаванняў ва ўсе святочныя дні правядуць вядучыя перадачы «Вітаем, віншуем, жадаем!».

Святочны эфір радыёстанцыі «Сталіца» таксама будзе напоўнены спецыяльнымі праектамі і навагодняй музыкай. Напрыклад, сапраўдным падарункам 31 снежня стане плэй-ліст з «залатымі хітамі» легендарных рок-зорак.

Канал «Культура» ў новым годзе застанецца верным свайму дэвізу «Мы выбіраем вечныя каштоўнасці», і ў эфіры будуць гучаць перадачы, якія расказваюць пра беларускую нацыянальную культуру. Напярэдадні навагодніх свят казачны настрой будуць ствараць музычныя і літаратурныя праекты. У апошні дзень 2023-га года ў перадачы «Радыётэатр плюс» пачуем спектакль-казку Г. Х. Андэрсэна «Каляднае быль». А кульмінацыяй вечара стане канцэрт «Сімфанічная казка», дзе зімовыя кампазіцыі прагучаць у выкананні заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Акадэмічнага хора і Сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі.

Міжнароднае радыё «Беларусь» прадставіць замежным слухачам на ўсіх дзевяці мовах вяшчання дайджэст найбольш значных падзей адыходзячага года ў палітычным, эканамічным, культурным і спартыўным жыцці нашай краіны. А ў тэматычных перадачах на розных мовах свету прагучаць сюжэты аб святкаванні Новага года, святочных дабрачынных акцыях. Святочныя праграмы выйдуць і ў эфіры рэгіянальных радыёстанцый ва ўсіх абласцях Беларусі.

Алена ДРАПКО.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 188

Пайшоў з жыцця вядомы беларускі шахматны кампазітар, наш сталы чытач і аўтар Мікалай Іванавіч Бельчыкаў (12.05.1947 — 15.12.2023). Нарадзіўся ён у вёсцы Шапарня на Жлобіншчыне, жыў у Барысаве, дзе да выхаду на пенсію працаваў інжынерам у галіне апрацоўкі металаў, начальнікам цэха... З 1968 года апублікаваў каля 500 задач, пераважна двухходовак, каля траціны з іх былі адзначаны ў конкурсах. Майстар спорту СССР і нацыянальны арбітр па шахматнай кампазіцыі. Пераможца ў раздзеле двухходовак аднаго з камандных першынстваў свету, фіналіст першынства СССР. У чэмпіянатах Беларусі ў розныя гады заваяваў залаты, два сярэбраныя і тры бронзавыя медалі. Вёў шматлікія шахматныя аддзелы ў друку, суаўтар кніг «Шахматная кампазіцыя ў Беларусі» і «Паэзія шахмат Беларусі». Наступная яго задача ў свой час заняла трэцяе месца ў камандным першынстве СССР *(гл. дыяграму)*.



Белыя: Kph3, Фе2, Лd1, Лf8, Ca2, Cg5, Kb5, Kd4, пп. c5, f4, h5 (11).

Чорныя: Крe4, Фc1, Лf6, Лh6, Cb1, Cd8, Ke3, Kh4, пf5 (9).

Мат за 2 хады.

